УЗГОДНЕНА
Намеснік старшыні
Мінгарвыканкама
_________________ А.М. Цуран
"_24_"_03_______________2023 г.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Намеснік начальніка
упраўлення культуры
Мінгарвыканкама
_________________ К.П.Лучына
"_24_"_03_______________2023 г.

# ПАЛАЖЭННЕ
## аб парадку правядзення
## фестывалю народнай творчасці "Сузор'е"
## (2023 – 2024 г.г.)

**I. Агульныя палажэнні**

- Палажэнне аб парадку правядзення фестывалю народнай творчасці "Сузор'е" (надалей – Палажэнне) распрацавана ў сувязі з правядзеннем гарадскога фестывалю народнай творчасці "Сузор'е" (надалей – фестываль) адпаведна рашэнню Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ад 20 кастрычніка 2016 года № 3115 "Об утверждении перечня городских фестивалей, конкурсов, форумов, праздников и пленэров, финансируемых из местного бюджета" і Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры (артыкул 250).
- Заснавальнікамі і арганізатарамі фестывалю з'яўляюцца:

– Упраўленне культуры Мінгарвыканкама
– Дзяржаўная ўстанова "Мінсканцэрт"
– Дзяржаўная ўстанова "Мінскі гарадскі Палац культуры".

- Арганізацыю фестывалю народнай творчасці "Сузор'е" забяспечвае ДУ "Мінсканцэрт", аддзел па рабоце з калектывамі народнай творчасці і культурна-асветнымі установамі.
- Палажэнне вызначае мэты і задачы фестывалю, парадак, умовы яго правядзення, падвядзенне вынікаў і заахвочванне ўдзельнікаў фестывалю.
- **Мэта правядзення фестывалю:** павышэнне сацыяльнай ролі і мастацкага ўзроўню аматарскай творчасці, яе ўплыву на развіццё грамадскай і творчай актыўнасці насельніцтва горада Мінска.
- **Задачы:**

– папулярызацыя лепшых узораў музычнага, тэатральнага, харэаграфічнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, відэа, фота і іншых відаў і жанраў народнага мастацтва;
– падтрымка нацыянальных культурных традыцый;
– захаванне пераемнасці ў развіцці народнай творчасці;
– шырокае далучэнне працоўных, служачых, моладзі, падлеткаў, дзяцей да заняткаў народным мастацтвам;
– развіццё ў працоўных калектывах, навучальных установах, ўстановах культурна-асветнай дзейнасці і дадатковай адукацыі самадзейных калектываў,

гурткоў, студый, майстэрняў, аб'яднанняў па інтарэсах розных відаў і жанраў народнага мастацтва;
– абагачэнне рэпертуару аматарскіх калектываў творамі народнага мастацтва, беларускіх аўтараў, лепшымі ўзорамі нацыянальнай і сусветнай мастацкай культуры;
– павышэнне ўзроўню выканаўчага майстэрства і сцэнічнай культуры калектываў народнай творчасці;
– стварэнне спрыяльных умоў для развіцця творчай дзейнасці ў самадзейных мастацкіх калектывах, супрацоўніцтва майстроў прафесійнага і аматарскага мастацтва;
– падтрымка творча адораных выканаўцаў, кампазітараў, балетмайстраў, хормайстраў, рэжысёраў, мастакоў і іншых майстроў самадзейнага мастацтва;
– арганізацыя вольнага часу жыхароў горада Мінска.

## II. Парадак і ўмовы правядзення фестывалю-конкурсу

- Фестываль у г. Мінску праводзіцца з красавіка 2023 г. па снежань 2024г. у чатыры этапы на падставе каляндарнага плана асноўных мерапрыемстваў фестывалю *(дадатак № 1)*.
- **I этап.** У I этапе фестывалю прымаюць удзел калектывы і асобныя выканаўцы прадпрыемстваў, арганізацый, клубных і навучальных устаноў, агульнаадукацыйных і музычных школ, устаноў дадатковай адукацыі, якія не маюць найменняў "народны", "узорны". Для ўдзелу ў I этапе фестывалю неабходна падаць заяўку ў раённы аддзел культуры па месцы жыхарства альбо па месцы вучобы ці працы.

Па выніках I этапа фестывалю лепшыя калектывы, асобныя выканаўцы, кіраўнікі калектываў узнагароджваюцца адміністрацыямі раёнаў г. Мінска.

- **II этап.** Выніковы раённы агляд-конкурс, удзельнікі якога паспяхова прайшлі I этап.

Для прагляду конкурсных праграм і выстаў раёнаў ствараецца кампетэнтнае журы (па жанрах), якое складаецца з членаў рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі, зацверджанай Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь (па гораду Мінску). Журы падводзіць вынікі агляду-конкурсу і прапаноўвае кандыдатуры яго ўдзельнікаў да заахвочвання. Рашэнне журы канчатковае і перагляду не падлягае.

Лепшыя калектывы II этапа фестывалю, асобныя выканаўцы ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэатаў, дыпламантаў I, II, III ступеняў паводле рашэння гарадскога журы.

Лепшыя режысерскія праграмы заключных канцэртаў таксама будуць адзначаны дыпломамі.

Арганізацыю правядзення і фінансаванне I і II этапаў фестывалю забяспечваюць адміністрацыі раёнаў г.Мінска.

За арганізацыю і правядзенне заключных канцэртаў II этапа фестывалю адміністрацыі раёнаў г. Мінска ўзнагароджваюцца дыпломамі Мінгарвыканкама.

Па пытаннях арганізацыі і правядзення заключнага мерапрыемства II этапа фестывалю-конкурсу можна атрымаць кансультацыю ў аддзеле па рабоце з калектывамі народнай творчасці і культурна-асветніцкімі ўстановамі:
(017) 224 35 12 – Кастрычніцкі раён, Заводскі раён, Першамайскі раён;
(017) 224 46 09 – Ленінскі раён, Маскоўскі раён;
(017) 263 21 31 – Фрунзенскі раён, Партызанскі раён;
(017) 263 73 06 – Цэнтральны раён, Савецкі раён.

▪ **III этап.** У III этапе фестывалю прымаюць удзел аматарскія калектывы мастацкай творчасці г. Мінска з найменнем “народны” і “узорны”. Удзел народных і ўзорных калектываў абавязковы і разглядаецца як пацвярджэнне ганаровага наймення, згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры (артыкул 250). Па выніках прагляду калектывам выдаецца пасведчанне аб пацвярджэнні наймення.

Калі калектыў, якому надышоў тэрмін пацвярджэння наймення “народны”, “узорны”, не прымаў ўдзел у фестывалі без уважлівых на тое прычын, ён пазбаўляецца наймення “народны”, “узорны” ва ўстаноўленым парадку.

Конкурсныя выступленні праходзяць публічна, згодна з каляндарным планам ***(дадатак 2***). Парадак выступлення вызначаецца жараб’ёўкай. Калектывы ў сваім выступленні могуць выкарыстоўваць відэапрэзентацыю.

Рэпертуар калектыву павінен быць адноўлены больш за 30% з часу апошняга пацвярджэння.

▪ Народныя і ўзорныя калектывы прадстаўляюць праграмы выступленняў:
– акадэмічныя хары і ансамблі – на 30 хвілін (не менш за 3 творы без суправаджэння);
– хары і ансамблі народнай песні, фальклорныя калектывы, хары ветэранаў, дзіцячыя хары – на 30 хвілін (не менш за 2 творы без суправаджэння);
– ансамблі песні, музыкі і танца – на 30 хвілін (не менш за 2 творы без суправаджэння; у суправаджэнні жывога гуку);
– калектывы з эстраднай манерай выканання – на 30 хвілін;
– харэаграфічныя ансамблі – да 40 хвілін;
– аркестры – на 30 хвілін (2 твора – суправаджэнне салістам);
– інструментальныя ансамблі – на 30 хвілін (2 твора – суправаджэнне салістам);
– тэатры – шматактны спектакль ад 40 хвілін;
– тэатры малых форм – праграму ад 40 хвілін;
– дзіцячыя тэатры – спектакль ад 30 хвілін;
– выяўленчае мастацтва і дэкаратыўна-прыкладная творчасць – выставы не меньш 16 $м^2$;
– студыі дызайна і пашыву адзення (паказ не меней 3 калекцый)

У рэпертуар калектываў уключаюцца лепшыя творы беларускай і замежнай класікі, сучасных аўтараў. Калектывам харавога і інструментальнага жанру, якія маюць найменні “народны”, “узорны” дазваляецца прыцягваць да

ўдзелу ў фестывалі выканаўцаў-прафесіяналаў выключна ў якасці салістаў. У ацэнку калектыва будзе ўключацца толькі суправаджэнне.

Выкарыстанне плюсавых фанаграм забаронена.

## III. Крытэрыі ацэнкі выступленняў і выстаў

▪ Для прагляду конкурсных выступленняў і выстаў ствараецца кампетэнтнае журы (па жанрах), якое складаецца з членаў рэспубліканскай атэстацыйнай камісіі, зацверджанай Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь (па гораду Мінску). Рашэнне журы канчатковае і перагляду не падлягае.

Пры ацэньванні выступленняў журы ўлічвае:

- падтрымку і развіццё беларускай нацыянальнай культуры;
- узровень выканаўчага майстэрства;
- узровень музычнага суправаджэння;
- складанасць рэпертуару, адпаведнасць узросту выканаўцаў;
- рэжысуру нумароў і цэласнасць праграмы;
- сцэнічную культуру, эстэтыку ў касцюміраванні калектыва;
- канцэртную дзейнасць калектыва;
- выкананне ўмоў конкурсу.

Пры ацэньванні выстаў журы ўлічвае:

- мастацкі ўзровень выставачных твораў;
- адраджэнне і развіццё беларускіх нацыянальных традыцый;
- умелае спалучэнне элементаў традыцыйнай творчасці з культурай гарадскога асяроддзя;
- выкарыстанне новых тэхнік і тэхналогій;
- экспазіцыйна-тэматычнае рашэнне выставы;
- развіты эстэтычны і мастацкі густ;
- выставачную і грамадска-карысную дзейнасць калектыва.

Пры ацэньванні калектываў дызайна і пашыву адзення журы ўлічвае:

- канцэптуалізацыю мастацка-канструктыўных прынцыпаў традыцыйнага касцюма у сучасным праектаванні адзення;
- арыгінальнасць творчай ідэі, майстэрства стварэння вобраза;
- паўнату раскрыцця тэмы праекта;
- мастацкі ўзровень;
- сцэнічную культуру;
- адпаведнасць музычнага суправаджэння выбранай тэматыцы

По выніках III этапа агляду-конкурсу “народныя”, “узорныя” калектывы, паводле рашэння журы, ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэата, дыпломамі I, II, III ступеняў.

Дзяржаўныя, грамадскія арганізацыі, творчыя саюзы маюць права ўстанаўліваць спецыяльныя прызы для ўдзельнікаў фестывалю.

Пераможцы II і III этапа фестывалю народнай творчасці “Сузор’е” будуць рэкамендаваны для ўдзела ў рэспубліканскіх і міжнародных фестывалях і конкурсах.

- **IV этап**. Заключны гала-канцэрт, у якім прымаюць удзел лепшыя калектывы з найменнем “народны” , “узорны” - пераможцы III этапа фестывалю народнай творчасці “Сузор’е”.

**IV. Фінансаванне конкурсу**

Фінансаванне гарадскога фестывалю народнай творчасці “Сузор’е” ажыццяўляецца за кошт сродкаў бюджэту г. Мінска і іншых крыніц фінансавання, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

**Дадатак № 1**
**да Палажэння аб парадку**
**правядзення фестывалю народнай**
**творчасці «Сузор'е» 2023–2024 гг.**

**Каляндарны план асноўных мерапрыемстваў**
**фестывалю народнай творчасці "Сузор'е"**
**(2023–2024 гг.)**

**Першы этап** – агляды, конкурсы калектываў народнай творчасці і асобных выканаўцаў, выставы студый выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў раёнах горада.

*красавік 2023 г.– кастрычнік 2023 г.*

**Другі этап** – заключныя канцэрты Дзён народнай творчасці раёнаў г. Мінска: (даты правядзення ўзгадняюцца з упраўленнямі ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Адміністрацый раёнаў)

*кастрычнік 2023 г. – снежань 2023 г.*

**Трэці этап**– агляды-конкурсы, выставы калектываў народнай творчасці на пацвярджэнне ганаровага наймення "народны", "узорны"

*студзень 2024г. – красавік 2024г.*

- Конкурс аркестраў, інструментальных ансамбляў "Камертон"
  *28 студзеня, 10, 11, 17 лютага, 7,14,20 красавіка 2024г.*
- Конкурс дзіцячых харавых калектываў "Маладыя галасы"
  *16,17,23,24 сакавіка 2024 г.*
- Конкурс харавых калектываў і ансамбляў народнай песні "Вытокі"
  *30,31сакавіка, 6 красавіка 2024 г.*
- Конкурс харавых калектываў і ансамбляў акадэмічнай песні "Натхненне"
  *27 студзеня-13 красавіка 2024г.*
- Конкурс вакальных калектываў з эстраднай манерай выканання
  *25 лютага 2024 г.*
- Конкурс харэаграфічных калектываў "Карункі"
  *24 лютага, 2,3 сакавіка 2024 г.*
- Конкурс тэатральных калектываў "Тэатральныя сустрэчы"
  *3,4 лютага 2024г.*

- Тэатры са шматактным спектаклем (па асобнаму графіку)

*студзень – красавік 2024 г.*

- Конкурс студый выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва "Чарадзеі" (па асобнаму графіку)

*студзень – красавік 2024 г.*

- Тэатры мод

*21 красавіка 2024 г.*

- Аматарскія аб'яднанні

*студзень – красавік 2024 г.*

**Чацвёрты этап** – заключны канцэрт фестывалю "Сузор'е"

*снежань 2024*

**** Даты правядзення конкурсаў могуць змяняцца.***

**Дадатак № 2**
**да Палажэння аб парадку правядзення фестывалю народнай творчасці «Сузор'е» 2023–2024 гг.**

## Графік правядзення мерапрыемстваў на пацвярджэнне найменняў калектываў «народны», «узорны» у рамках Мінскага гарадскога фестывалю народнай творчасці «Сузор'е" 2023-2024 г.г.

| *Дата правядзення* | *Месца правядзення* | *Час правя дзення* | *Назва мерапрыемства* |
|---|---|---|---|
| | | | ***СТУДЗЕНЬ*** |
| 27.01.2024 | ДК ветэранаў | 10.00 | "Натхненне" – ветэранскія калектывы |
| 28.01.2024 | к/з "Верхні горад" | 10.00 | "Камертон" - камерныя аркестры |
| 18, 25.01. 2024 | на месцах работы калектываў | | "Чарадзеі" – калектывы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва |
| | | | ***ЛЮТЫ*** |
| 03.02.2024 | МГПК | | "Тэатральныя сустрэчы"- тэатральныя калектывы |
| 04.02.2024 | МГПК | | "Тэатральныя сустрэчы"- тэатральныя калектывы |
| 10.02.2024 | МГПК | 10.00 | "Камертон" - аркестры народных інструментаў |
| 11.02.2024 | МГПК | 10.00 | "Камертон" - аркестры народных інструментаў |
| 17.02.2024 | МГПК | 10.00 | "Камертон" - эстрадныя аркестры |
| 24.02.2024 | МГПК | | "Карункі" – харэаграфічныя калектывы |
| 25.02.2024 | МГПК | 10.00 | Вакальныя калектывы з эстраднай манерай выканання |
| 1,8,15,22,29 | на месцах работы калектываў | | "Чарадзеі" – калектывы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва |
| па асобнаму графіку | на месцах работы калектываў | | Тэатры са шматактным спектаклем |
| | | | ***САКАВІК*** |
| 02.03.2024 | МГПК | 10.00 | "Карункі" – харэаграфічныя калектывы |
| 03.03.2024 | МГПК | 10.00 | "Карункі" – харэаграфічныя калектывы |
| 16.03.2024 | к/з "Верхні горад" | 10.00 | «Маладыя галасы» - дзіцячыя харавыя калектывы |
| 17.03.2024 | к/з "Верхний город" | 10.00 | «Маладыя галасы» - дзіцячыя харавыя калектывы |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 23.03.2024 | к/з “Верхні горад” | 10.00 | “Маладыя галасы” - дзіцячыя харавыя калектывы |
| 24.03.2024 | к/з “Верхні горад” | 10.00 | “Маладыя галасы” - дзіцячыя харавыя калектывы |
| 30.03.2024 | МГПК | 10.00 | “Вытокі” - харавыя калектывы і ансамблі народнай песні |
| 31.03.2024 | МГПК | 10.00 | “Вытокі”- харавыя калектывы і ансамблі народнай песні |
| 14, 21, 28 | на месцах работы калектываў | | “Чарадзеі” – калектывы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва |
| па асобнаму графіку | на местцах работы калектываў | | Тэатры са шматактным спектаклем |
| ***КРАСАВІК*** | | | |
| 06.04.2024 | МГПК | 10.00 | “Вытокі” - харавыя калектывы і ансамблі народнай песні |
| 07.04.2024 | МГПК | 10.00 | “Камертон” - духавыя аркестры |
| 13.04.2024 | к/з “Верхні горад” | 10.00 | “Натхненне”- харавыя калектывы і ансамблі акадэмічнай песні |
| 14.04.2024 | к/з “Верхні горад” | 10.00 | “Камертон” - скрыпачы |
| 20.04.2024 | к/з “Верхні горад” | 10.00 | “Камертон” - цымбалісты |
| 21.04.2024 | МГПК | 10.00 | Тэатры мод |
| 4, 11, 18, 25 | на месцах работы калектываў | | “Чарадзеі” – калектывы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва |
| па асобнаму графіку | на местцах работы калектываў | | Тэатры са шматактным спектаклем |

**** Даты правядзення конкурсаў могуць змяняцца.***